

# ВЯЛІКАЯ АЙЧЫННАЯ ВАЙНА

*(агляд матэрыялаў круглага стала, які адбыўся ў Інстытуце гісторыі НАН Беларусі 3 сакавіка 2010 г.)*

*Сёлета Рэспубліка Беларусь святкуе 65-годдзе Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Гэтай нагодзе быў прысвечаны круглы стол, які адбыўся 3 сакавіка 2010 г. у Інстытуце гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Рэдакцыя «Беларускага гістарычнага часопіса» прапануе матэрыял, прысвечаны гэтай падзеі.*



*Дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі А.А.Каваленя адкрывае пасяджэнне круглага стала.*

На пасяджэнні круглага стала прысутнічалі супрацоўнікі Інстытута гісторыі НАН Беларусі і ВНУ рэспублікі, прадстаўнікі архіўных службаў, музеяў, міністэрстваў абароны, унутраных спраў, Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, пісьменнікі, літаратары і журналісты. Яны сабраліся дзеля таго, каб яшчэ раз узгадаць падзеі вайны, абмеркаваць актуальныя пытанні яе даследавання, расказаць пра ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі на прыкладах мужнасці і гераізму, праяўленых нашымі людзьмі ў тыя дні.

Асноўнымі пытаннямі, па якіх падчас гэтага мерапрыемства адбыліся дыскусіі, былі пытанні аб усенародным характары барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, неабходнасці ліквідаваць "белыя плямы" ў айчыннай ваеннай гістарыяграфіі, аб фальсіфікацыі гісторыі вайны, аб асаблівасцях тэрміналогіі, а менавіта аб значэнні назвы "Вялікая Айчынная вайна" для беларускай гістарычнай навукі і свядомасці нашага народа.

Адкрыў пасяджэнне дырэктар Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар **Аляксандр Каваленя**. Ён адзначыў, што адной з актуальных праблем з'яўляецца захаванне памяці аб падзеях вайны. На беларускай зямлі каля 8,5 тыс. памятных месцаў, братэрскіх магіл, абеліскаў і помнікаў, з якіх амаль 6 тыс. складаюць воінскія пахаванні перыяду Другой сусветнай вайны. Праца па ўвекавечанню гераізму і мужнасці людзей прадаўжаецца і сёння. Штогод узводзяцца новыя помнікі воінскай славы, аднаўляюцца і рэстаўрыруюцца шматлікія манументы і памятныя знакі. Гэта не проста павага беларускага народа да гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а і даніна памяці тым, хто паклаў сваё жыццё на алтар Вялікай Перамогі.

Гісторык падкрэсліў, што памяць аб вялікіх ратных здзяйсненнях народа заўсёды з'яўлялася найважнейшай духоўнай сутнасцю ідэалогіі кожнай перамагаючай дзяржавы. Пры гэтым перамога Савецкага Саюза над нацысцкай Германіяй была атрымана ў справядлівай, вызваленчай вайне. "Я хачу падкрэсліць, што беларускі народ па сваёй сутнасці — народ-праведнік. ПРАВЕДНІК — у праваслаўі святы, які праславіўся подзвігамі і святасцю жыцця ў звычайных мірскіх умовах... Вось гэтую ідэю нам неабходна ўзняць на новы ўзровень", — адзначыў А.Каваленя.

Дырэктар Інстытута гісторыі падкрэсліў, што навуковая распрацоўка пытанняў гісторыі Другой сусветнай вайны ў наш час набывае прынцыповы характар, паколькі сёння робіцца шмат для таго, каб пасеяць недавер і стварыць раздзяляльныя бар'еры паміж краінамі. Далей ён адзначыў: "На наша шчасце, такія праекты рыхтуюцца не ў Кіеве, не ў Варшаве, не ў Маскве і тым больш не ў Мінску. Аднак пры дапамозе сіл, якія ёсць у названых краінах, гэтыя праекты высоўваюцца пастаянна і накіраваны на стварэнне раздзяляльных бар'ераў у славянскім свеце. Здавалася б, Расія і Польшча затрацілі столькі сіл для таго, каб уладзіць праблему Катынскай трагедыі, як з'явілася праблема АУН—УПА, затым Галадамор, потым беларуска-польская і г.д.". А.Каваленя выказаў упэўненасць, што ніхто не можа пазбавіць Рэспубліку Беларусь права на ініцыятыву выступаць аб'ядноўваючым цэнтрам славянскага свету, і заклікаў звярнуцца да народаў і іх лідэраў з пытаннем аб недапушчэнні палітыкі супрацьстаяння ў славянскім свеце і аб стварэнні Пантэона памяці, прабачэння і прымірэння. Сваё выступленне ён закончыў такімі словамі: "Гэта зусім не значыць, што мы не павінны вывучаць вострых, складаных і супярэчлівых старонак гісторыі. Думаю, што нават наадварот, могуць быць створаны сумесныя працоўныя навуковыя групы па даследаванню найбольш складаных і недастаткова вывучаных праблем агульнай гісторыі".

Дырэктар Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук **Уладзімір Адамушка** расказаў пра публікацыі дзяржаўных архіваў 2005—2010 гг., прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне. У справе падрыхтоўкі зборнікаў дакументаў і архіўных даведнікаў нашы архівы плённа супрацоўнічаюць з рознымі арганізацыямі як у Беларусі, так і за яе межамі.

Аснова ўзаемадзеяння беларускіх і нямецкіх даследчыкаў у галіне высвятлення лёсаў савецкіх ваеннапалонных была закладзена дамовай ад 29 красавіка 2002 г. паміж аб'яднаннем "Саксонскія мемарыялы ў памяць ахвяр палітычнага тэрору" (Германія) і Нацыянальным цэнтрам (цяпер — Дэпартамент) па архівах і справа-водству. Вынікам іх працы стала кніга "Цайтхайн — Книга Памяти советских военнопленных" (Мінск—Дрэздэн, 2006).

Сумеснымі намаганнямі беларускіх і расійскіх архівістаў былі выдадзены зборнікі дакументаў і матэрыялаў "Освобождённая Беларусь" (у 2-х кнігах) (Мінск, 2004—2005), "Приказано приступить: эвакуация заключённых из Беларуси в 1941 году" (Мінск, 2005), "Беларусь в первые месяцы Великой Отечественной войны (22 июня—август 1941 г.)" (Мінск, 2006), "Накануне. Западный особый военный округ (конец 1939 г.—1941 г.)" (Мінск, 2007), даведнік "Беларусь в постановлениях и распоряжениях Государственного Комитета Обороны СССР 1941—1945 гг." (Мінск, 2008).

Ваенныя падзеі на асобных тэрыторыях Беларусі знайшлі адлюстраванне ў зборніках дакументаў і матэрыялаў "Гродненщина накануне и в годы Великой Отечественной войны (1939—1945)" (Гродна, 2005) і "Витебщина освобождённая: октябрь 1943—декабрь 1945" (Віцебск, 2009). У 2005 г. убачыў свет падрыхтаваны сумесна з Інстытутам гісторыі НАН Беларусі зборнік "Авиация — партизанам, 1941—1944", дзе побач з архіўнымі дакументамі апублікаваны ўспаміны баявых лётчыкаў аб удзеле авіяцыі ў матэрыяльна-тэхнічным забеспячэнні партызанскіх фарміраванняў, эвакуацыі людзей у савецкі тыл.

Першым у айчыннай гістарыяграфіі выданнем, прысвечаным удзелу яўрэяў у партызанскім руху, з'я-

вілася кніга "Встали мы плечом к плечу...: евреи в партизанском движении Белоруссии, 1941—1944 гг." (Мінск, 2005), дзе змешчаны спісы яўрэяў-партызан — больш за 8 500 чалавек. Праблеме Халакосту прысвечаны дзве кнігі (сумесныя выданні ДАС Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскага фонду "Халакост" і Музея гісторыі і культуры яўрэяў Беларусі): дакументальныя зборнікі "Выжить — подвиг: воспоминания и документы о Минском гетто" (Мінск, 2008) і "Свидетельствуют палачи. Уничтожение евреев на оккупированной территории Беларуси в 1941—1944 гг." (Мінск, 2009). У першым апублікаваны ўспаміны вязняў Мінскага гета, запісы размоў у 1942—1944 гг. супрацоўнікаў разведвальнага аддзела БШПР з партызанамі — былымі вязнямі гета і падпольшчыкамі; у другім — дакументы нямецкіх устаноў і воінскіх фарміраванняў, а таксама сведчанні нямецкіх ваеннапалонных.

Рэжым акупацыі і звязаныя з ім бедствы народа паказаны ў навукова-папулярным выданні В.Селяменева і В.Шымоліна "Охота на палача: историко-документальный очерк" (Мінск, 2007), аўтары якога зрабілі спробу развеяць многія тайны, звязаныя са знішчэннем у 1943 г. Генеральнага камісара Беларусі В.Кубэ. Аб знішчэнні ў сакавіку 1943 г. вёскі Хатынь, а таксама гісторыі ўзвядзення тут мемарыяльнага комплексу расказвае зборнік дакументаў і матэрыялаў "Хатынь. Трагедия и память" (Мінск, 2009).

У.Адамушка адзначыў, што ў апошні час дзяржаўныя архівы Беларусі звярнуліся да новых тэм у публікацыйнай дзейнасці. У 2007 г. быў выдадзены двухмоўны зборнік 12 артыкулаў аўстрыйскіх, беларускіх і расійскіх даследчыкаў "Австрийцы и судетские немцы перед советскими военными трибуналами в Беларуси 1945—1950 гг.", падрыхтаваны сумесна з Інстытутам імя Людвіга Больцмана па даследаванню наступстваў войнаў у Грацы (Аўстрыя) — першае выданне аб савецкіх пасляваенных працэсах над нацысцкімі злачынцамі.

Праблемы ўвекавечання памяці воінаў Чырвонай Арміі, партызан, падпольшчыкаў і мірных грамадзян знайшлі адлюстраванне ў зборніку дакументаў і матэрыялаў "Увековечение памяти защитников Отечества и жертв войн в Беларуси, 1941—2008 гг." (Мінск, 2008), падрыхтаваным архівістамі НАРБ сумесна з Упраўленнем па ўвекавечанню памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр войнаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. Дакументы дзяржаўных архіваў шырока прадстаўлены ў розных зборніках артыкулаў, звязаных з навуковымі канферэнцыямі і круглымі сталамі, сярод якіх — "Выстояли и победили: свидетельствуют архивы" (Віцебск, 2005), "Пра вайну апошняе слова не сказана" (Мінск, 2005), "Быў подзвіг. І была перамога" (Мінск, 2006).

Усяго ў 2005—2010 гг. дзяржаўнымі архівамі былі падрыхтаваны і апублікаваны 23 зборнікі дакументаў. У канцы свайго выступлення У.Адамушка сказаў, што 65-годдзю Вялікай Перамогі будуць прысвечаны новыя зборнікі дакументаў: "Белорусы в советском тылу", "Гомельская область в первые месяцы Великой Отечественной войны" і "Гомельщина партизанская. 1941—1942 гг.".

Архіўныя службы на круглым стале прадстаўлялі таксама дырэктар Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук Вячаслаў Селяменеў; загадчык аддзела публікацыі дакументаў НА РБ, кандыдат гістарычных навук Віталь Скалабан; вядучы навуковы супрацоўнік НА РБ, кандыдат гістарычных навук Анатоль Вялікі. Начальнік аддзела Цэнтральнага архіва КДБ Рэспублікі Беларусь, кандыдат гістарычных навук **Ігар Валахановіч** прысвяціў сваё паведамленне ўдзелу архіва ў міжнародным навукова-даследчым праекце "Савецкія і нямецкія ваеннапалонныя і інтэрніраваныя. Вывучэнне пытанняў гісторыі Другой сусветнай вайны і пасляваеннага перыяду", які распачаўся па ініцыятыве германскіх даследчыкаў у 2000 г. з мэтай устанаўлення лёсаў і месцаў пахаванняў савецкіх ваеннапалонных, якія загінулі ў германскім палоне, а таксама германскіх ваеннапалонных, якія загінулі ў савецкім палоне. Першапачаткова праект быў германа-расійскі, удзел у ім прымалі Дакументальны цэнтр аб'яднання "Саксонскія мемарыялы ў памяць ахвяр палітычнага тэрору" і архіўныя службы Міністэрства абароны, Міністэрства ўнутраных спраў і Федэральнай службы бяспекі Расійскай Федэрацыі. У 2002 г. да праекта далучыліся архівісты Беларусі, у тым ліку Цэнтральны архіў КДБ Рэспублікі Беларусь, у 2004 г. — архівісты Украіны, у тым ліку Дзяржаўны галіновы архіў Службы бяспекі Украіны.

Аснову навукова-даследчай работы ў рамках праекта склала апрацоўка інфармацыі з картак савецкіх ваеннапалонных, што ў гады вайны захоўваліся ў Даведачнай службе вермахта (ВАСт). Пасля разгрому Германіі большая частка картак у якасці трафеяў была вывезена ў СССР і перададзена на захаванне ў Падольскі архіў (цяпер Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі), а таксама архівы органаў дзяржаўнай бяспекі, у тым ліку і Беларусі. Тут гэтыя карткі атрымалі назву "трафейных картак на савецкіх ваеннапалонных". Рэалізацыя праекта прадугледжвае вывучэнне і апрацоўку германскім, расійскім, беларускім і ўкраінскім бакамі некалькіх мільёнаў картак у адносінах больш чым мільёна савецкіх ваеннапалонных, пасля чаго ўся апрацаваная расійскімі, беларускімі і ўкраінскімі даследчыкамі інфармацыя перыядычна перадаецца нямецкаму боку для абагульнення і ўводу ў адзіную электронную базу. Па меры неабходнасці абагульненая інфармацыя прадастаўляецца кожнаму з удзельнікаў праекта.

Супрацоўнікамі Цэнтральнага архіва КДБ былі апрацаваны і ўведзены ў электронную базу даных "Савецкія ваеннапалонныя" звесткі больш чым на 12 тыс. чалавек. На дадзены момант вывучаны ўсе трафейныя карткі (больш за 20 тыс.), якія маюцца ў Цэнтральным архіве КДБ, распачата апрацоўка картак з архіва ўпраўлення КДБ па Віцебскай вобласці. Плануецца вывучэнне трафейных дакументаў, якія знаходзяцца на захаванні ў архівах упраўленняў КДБ

па Брэсцкай, Гомельскай і Гродзенскай абласцях. Трафейныя карткі, якія раней захоўваліся ў архіве ўпраўлення КДБ па Магілёўскай вобласці, у 1994 г. былі перададзены на пастаяннае захаванне ў Дзяржаўны архіў Магілёўскай вобласці.

На сёння ўстаноўлены звесткі пра дату смерці і месцы пахавання больш за 22 тыс. савецкіх ваеннапалонных — ураджэнцаў Беларусі. Дзякуючы інфармацыі, апублікаванай КДБ у рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ, былі ўстаноўлены родныя больш за 500 савецкіх ваеннапалонных-ураджэнцаў Беларусі, якія загінулі ў германскім палоне. Звесткі аб даце смерці савецкіх воінаў, месцах іх пахаванняў, а таксама копіі выяўленых у архівах дакументаў былі перададзены родным загінуўшых падчас урачыстых мерапрыемстваў у Магілёве (2006 г.), Віцебску (2008 г.), Мінску (2009 г.) і Гомелі (2010 г.).

Загадчык аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук, прафесар **Аляксей Літвін** пачаў сваё выступленне з пытання аб тым, дзеля чаго праводзяцца навуковыя канферэнцыі і круглыя сталы па гісторыі вайны. Па-першае, гэта даніна Памяці тым, хто аддаў сваё жыццё, здароўе за тое, каб жылі наступныя пакаленні. І пакуль дзяржава і грамадскасць адзначаюць юбілеі Перамогі, будзе існаваць Памяць. Аднак сёння моладзь вельмі мала ведае аб мінулай вайне, аб тым, што з'яўляецца гонарам усяго беларускага народа — партызанскім руху і падпольнай барацьбе. Па-другое, гэта сустрэчы вучоных для таго, каб дзяліцца сваімі напрацоўкамі, апрабоўваць вынікі даследаванняў. А.Літвін звярнуў увагу журналістаў на тое, што існуе пэўная адлегласць паміж станам навуковых распрацовак па той ці іншай праблеме і ступенню папулярызацыі ведаў аб гэтым сярод насельніцтва. Ён адзначыў, што ў апошнія гады зроблена вялікая работа на публікацыі дакументальных крыніц, якая параўнальная з дзесяцігоддзямі савецкага часу. Яна не павінна быць спынена, і ў ідэале кожная вобласць, кожны раён павінны выдаць дакументальныя зборнікі аб мінулай вайне, перавыдаць на новым узроўні раённыя кнігі "Памяць".

Расказаў А.Літвін і аб працы аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін. У наступным годзе павінна выйсці з друку калектыўнае абагульняючае даследаванне "Беларусь у войнах і ваенных канфліктах XX стагоддзя", дзе ўпершыню будзе зроблена спроба комплексна паказаць удзел беларусаў і жыхароў Беларусі ў розных войнах: руска-японскай (1904—1905), Першай сусветнай (1914—1918), польска-савецкай (1919—1921), ваенных канфліктах 1920—1930-х гг., Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнах, ваенных канфліктах 1950—1980-х гг. Аддзел збірае дакументы, фотаздымкі, успаміны жыхароў Беларусі, якія ўдзельнічалі ў пасляваенных канфліктах (у Анголе, Афганістане, В'етнаме, Егіпце, Карэі, Кітаі, Кубе, Мазамбіку, Сірыі, Эфіопіі), стварае банк дакументальных звестак аб нашых суайчынніках.

А.Літвін нагадаў, што 12 сакавіка 2010 г. — 70-ці гадовы юбілей заканчэння савецка-фінляндскай вайны (1939—1940), якая па шэрагу прычын замоўчвалася савецкай гістарыяграфіяй. Аддзел падрыхтаваў да друку кнігу "Савецка-фінляндская вайна і Беларусь", у якой упершыню сказана аб удзеле ў гэтай вайне трох стралковых (3, 10, 23 ск) і аднаго кавалерыйскага (3 кк) карпусоў, дзесяці стралковых (4, 8, 50, 52, 100, 113, 122, 139, 150, 164) і трох кавалерыйскіх (7, 24, 36) дывізій, танкавых, артылерыйскіх, авіяцыйных і іншых часцей і падраздзяленняў Беларускай асобай ваеннай акругі агульнай колькасцю больш за 120 тыс. чалавек. У кнізе прыведзены звесткі аб больш за 9,5 тыс. нашых суайчыннікаў, якія загінулі на гэтай вайне.

Сёння маладаследаваным застаецца пытанне аб удзеле аб'яднанняў, злучэнняў і часцей, што ўдзельнічалі ў савецка-фінляндскай вайне, у абарончых баях на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. Так, пасля заканчэння савецка-фінляндскай вайны на тэрыторыю Беларусі вярнуліся 8, 50, 100, 139 і 150-я стралковыя дывізіі, а таксама дадаткова прыбылі 9 новых стралковых дывізій (17, 24, 37, 42, 49, 56, 75, 86 і 155-я). Многія ўдзельнікі савецка-фінляндскай вайны прымалі ўдзел у партызанскім руху і падпольнай барацьбе, вызначыліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны, сталі Героямі Савецкага Саюза, вядомымі военачальнікамі.

Сугучным па тэме з выступленнем А.Літвіна з'яўляецца паведамленне навуковага супрацоўніка аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі **Ірыны Варанковай**, прысвечанае канфліктам канца 1920-х—1930-х гг., якія сталі пралогам Другой сусветнай вайны, у прыватнасці, узброенаму канфлікту паміж СССР і Кітаем у раёне Кітайска-Усходняй чыгункі ў 1929 г.,вайне ў Іспаніі ў 1936—1939 гг., грамадзянскай вайне ў Кітаі і японска-кітайскай вайне ў перыяд 1923—1941 гг., сутыкненням паміж СССР і Японіяй у раёнах возера Хасан у Забайкаллі ў 1938 г. і ракі Халхін-Гол у Манголіі ў 1939 г. Падчас гэтых ваенных падзей ураджэнцы Беларусі ўваходзілі як у склад ваенных дарадцаў высокага рангу — каманднага і кіраўнічага, так і радавога саставу воінскіх злучэнняў і часцей, прадстаўлялі практычна ўсе роды войскаў. Адным з галоўных вынікаў працы аддзела стала ўстанаўленне 278 імёнаў і біяграфічных даных беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі, якія прымалі той ці іншы ўдзел у азначаных ваенных канфліктах. 125 з іх загінулі ў ходзе баявых дзеянняў, практычна ўсе былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, восем удастоены звання Героя Савецкага Саюза (лётчык С.І.Грыцавец і танкісты Ф.К.Каўроў, П.Е.Купрыянаў, М.А.Сяліцкі, Г.М.Склязнёў — за баі ў Іспаніі, лётчыкі А.С.Благавешчанскі і Я.М.Нікаленка — у Кітаі, С.І.Грыцавец — другі раз за Халхін-Гол). Большасць з тых, хто прайшоў баявую закалку ў 1930-я гг., у наступным змагаліся на франтах Вялікай Айчыннай вайны і ў партызанскім руху Беларусі, былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод і воінскіх званняў.

Вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, доктар гістарычных навук **Уладзімір**

**Кузьменка** ў сваім выступленні закрануў праблему перагляду гісторыі і вынікаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ён нагадаў, што падчас "халоднай вайны" ў сродках масавай інфармацыі і працах грамадазнаўцаў заходніх краін быў створаны малапрывабны вобраз СССР перыяду 1939—1945 гг., каб свядома паменшыць уклад савецкай дзяржавы ў разгром нацызму. Праводзілася думка пра тое, што ад страшнай пагрозы нацызму чалавецтва выратавалі перш за ўсё краіны "свабоднага свету". У.Кузьменка падкрэсліў, што, зыходзячы з палітычных мэтаў, такая лінія праводзіцца многімі замежнымі грамадазнаўцамі і цяпер, калі Савецкага Саюза больш няма. Інфармацыйна-ідэалагічны ціск працягваецца ўжо на былыя рэспублікі СССР, якія сталі незалежнымі дзяржавамі. Пры гэтым відавочна імкненне пераглядзець тэрытарыяльныя падзелы па выніках Другой сусветнай вайны, прычым не ўсе, а толькі тыя, што былі зроблены на карысць савецкіх краін. І прасочваецца гэтая тэндэнцыя не толькі ў СМІ, але і на дзяржаўным узроўні.

У.Кузьменка сказаў: "Нападкі на нашу Перамогу вядуцца па некалькіх напрамках. У прыватнасці, СССР абвінавачваюць у падрыхтоўцы з канца 1930-х гг. заваёўніцкага паходу ў Цэнтральную і Заходнюю Еўропу, у падрыхтоўцы нападзення на Германію летам 1941 г., у выніку, у развязванні вайны. ...Галоўная прычына перагляду і фальсіфікацый — палітыка. Аднак не толькі. У шэрагу аўтараў — і ў замежжы, і на постсавецкай прасторы — ёсць і камерцыйны інтарэс: зарабіць грошы на нездаровай "сенсацыйнасці". Вось тут і даводзіцца гаварыць пра сумленную працу вучонага-гісторыка, з аднаго боку, і фальсіфікацыі, з другога".

Далей У.Кузьменка адзначыў: "Тут і там даводзіцца чытаць аб "новых падыходах" у замежнай гістарыяграфіі па гісторыі Беларусі перыяду Другой сусветнай вайны. У чым жа заключаецца навізна? У адмаўленні эфектыўнасці антыфашысцкай барацьбы? У тым, што акцэнт робіцца пераважна на Халакост, а славяне ў якасці ахвяр генацыду не ўзгадваюцца, што пра знішчэнне рускіх, беларусаў, украінцаў, палякаў амаль не гавораць? Замежную, у тым ліку сучасную гістарыяграфію па ваеннай гісторыі Беларусі, канечне, неабходна вывучаць, але наўрад ці нам варта апладзіраваць ёй за "навацыйнасць". Маладыя аўтары пішуць некалькі іначай, чым іх калегі ў перыяд "халоднай вайны", аднак, як і іх папярэднікі, яны часта дрэнна ведаюць нашы архівы, засноўваюцца галоўным чынам на нямецкіх дакументах. У выніку шэрагам аўтараў пры апісанні антыфашысцкай барацьбы, партызанскага руху прымяняюцца заходнія меркі і ацэнкі: выгада, карысць, кар'ера і г.д. Пра патрыятызм, маральныя пабуджэнні гаворка не ідзе". У канцы У.Кузьменка справядліва адзначыў, што важна не толькі прачытаць і пераказаць нашай аўдыторыі тое, што заходнія аўтары пішуць пра Беларусь, але і ўступіць з імі ў палеміку. Тым больш, што ў самой Беларусі таксама былі спробы нацыяналістычнай рэвізіі гісторыі Другой сусветнай вайны, асабліва ў першай палове 1990-х гг., калі прапагандаваліся кнігі і артыкулы пракалабарацыянісцкага кірунку.

Галоўная думка выступлення дацэнта кафедры тактыкі і агульнаваенных дысцыплін Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, кандыдата гістарычных навук **Барыса Далгатовіча** была сфармулявана ім самім у наступнай фразе — "пісаць гісторыю трэба з чыстым сумленнем". Даследчык пашкадаваў, што і праз 65 гадоў пасля 9 мая 1945 г. на старонках часопісаў і газет, у навучальных дапаможніках, перадачах радыё і тэлебачання па-ранейшаму з'яўляюцца памылковыя ці скажоныя тлумачэнні тых ці іншых падзей, а часам увогуле домыслы, якія не маюць нічога агульнага з гістарычнай праўдай. Асновай жа гэтай праўды з'яўляюцца людзі, падзеі, факты, а таксама лічбы і даты. Аднак, па словах Б.Далгатовіча, "ваенная статыстыка кульгае на абедзве нагі". Адны і тыя ж лічбы, як і раней, тыражуюцца з аднаго выдання ў іншае без належнай крытычнай праверкі і навуковага абгрунтавання. І гэта ў той час, калі адкрыліся амаль усе фонды ваенных архіваў як у Расійскай Федэрацыі, так і ў Рэспубліцы Беларусь.

У якасці прыкладу Б.Далгатовіч правёў агульнавядомае сцвярджэнне, што ў гады Вялікай Айчыннай вайны на франтах змагаліся 217 генералаў і адміралаў беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. Ён расказаў, што да апошняга часу ніхто не раскрыў гэтую лічбу па прозвішчах, па радах войскаў, па катэгорыях, па гадах прысваення званняў. Пяць гадоў таму Б.Далгатовіч гэта зрабіў і прыйшоў да высновы, што ў 1940—1945 гг. званні генералаў і адміралаў былі прысвоены амаль 400 нашым землякам.

Расказаў Б.Далгатовіч і пра свой артыкул у газеце "Вечерний Минск" ад 16 лістапада 2009 г., прысвечаны гадавіне подзвігу 28 герояў-панфілаўцаў. У ім аўтар на падставе архіўных даных устанавіў, што 4-й ротай 1075-га стралковага палка 316-й стралковай дывізіі генерала І.В.Панфілава камандаваў беларус капітан Павел Міхайлавіч Гундзіловіч, які нарадзіўся ў 1902 г. у в.Ліцвяны Уздзенскага раёна Мінскай вобласці. Загінуў ён камбатам 10 красавіка 1942 г. у пас. Першамайскае Наўгародскай вобласці на Паўночна-Заходнім фронце. Усяго ў роце было 130—140 чалавек, амаль усе яны загінулі ў баях пад Масквой у перыяд з 6 кастрычніка па 16 лістапада 1941 г. На жаль, устанавіць гэтыя факты ўдалося толькі праз амаль 70 гадоў пасля тых падзей. У канцы выступлення Б.Далгатовіч адзначыў, што праўда гісторыі толькі адна, і што дзвюх праўд не бывае. Подзвігі людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны, іх Перамога па-ранейшаму аб'ядноўвае і цэментуе людзей розных узростаў і пакаленняў. Галоўнае ў даследаванні — абапірацца толькі на архіўныя дакументы, навукова і крытычна асэнсоўваць падзеі і факты.

Загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт **Сяргей Новікаў** выступіў з дакладам "Штурм і абарона Брэсцкай крэпасці летам 1941 года: у пошуках гістарыч-

най ісціны". Падставай для звароту да гэтай тэмы з'явілася выданне ў 2008 г. у Маскве 800-старонкавай кнігі сібірскага гісторыка Р.Аліева "Штурм Брестской крепости", дзе з нямецкага боку амаль пахвілінна паказаны ход баявых дзеянняў падчас заняцця падраз-дзяленнямі 45-й нямецкай пяхотнай дывізіі абарончага плацдарма Брэсцкай крэпасці.

С.Новікаў адзначыў, што вострая патрэба ва ўсебаковым аналізе ходу баявых дзеянняў і крытычным асэнсаванні іх фактычных вынікаў як для нямецкага, так і савецкага бакоў вынікае з увядзення ў апошні час у навуковы зварот шэрагу прынцыпова важных дакументаў. У пытанні вывучэння абароны Брэсцкай крэпасці і сёння застаюцца "белыя плямы", паколькі галоўная ўвага традыцыйна надавалася гераічным старонкам падзеі, у той час як трагічны лёс большасці ўдзельнікаў абароны быў пакінуты без належнай увагі. Маюцца на ўвазе 101 савецкі афіцэр і 7 122 малодшыя камандзіры і радавыя — амаль трэць асабовага складу 6-й і 42-й савецкіх стралковых дывізій па стану іх укамплектаванасці на 22 чэрвеня 1941 г. Гэта значыць, на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці і ў рысе горада Брэста да канца месяца ў нямецкі палон трапілі 7 223 чырвонаармейцы. Пры гэтым вечарам 28 чэрвеня на тэрыторыі крэпасці немцамі былі выяўлены "амаль 2000 забітых рускіх". Аднак пытанні аб прычынах палону, месцазнаходжанні савецкіх палонных і аб іх лёсе пакуль застаюцца адкрытымі. Сёння перад беларускімі гісторыкамі стаіць важная задача — ліквідаваць выяўленую "белую пляму" і максімальна садзейнічаць поўнаму і ўсебаковаму раскрыццю падзей, звязаных з абаронай Брэсцкай крэпасці, пра што яшчэ ў канцы 1970-х гг. пісаў у сваёй кнізе "Сражается крепость" легендарны яе абаронца Герой Савецкага Саюза П.М.Гаўрылаў. Рэдакцыя "Беларускага гістарычнага часопіса" плануе апублікаваць у наступных нумарах артыкул, прысвечаны гэтай праблеме.

Загадчык кафедры гісторыі Беларусі Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С.Пушкіна, кандыдат гістарычных навук, дацэнт **Уладзімір Здановіч** у сваім выступленні расказаў пра асаблівасці даследавання гісторыі вайны ў беларускай савецкай і сучаснай гістарыяграфіі. Ён адзначыў, што ў 1990-я гг. у навуковых працах і публікацыях праявіліся два супрацьлеглыя падыходы. Прыхільнікі першага імкнуліся пераадолець устойлівыя ідэалагічныя штампы шляхам вылучэння побач з традыцыйнымі тэмамі новых актуальных, прыярытэтных напрамкаў даследавання, якія ў савецкія часы па розных прычынах заставаліся па-за сферай увагі даследчыкаў; прыхільнікі другога праявілі новую тэндэнцыйнасць да адлюстравання падзей, заснаваную на простай замене плюса на мінус і мінуса на плюс, што прывяло да з'яўлення новых стэрэатыпаў і міфаў і не садзейнічала набліжэнню да аб'ектыўнага разгляду складаных праблем.

Далей У.Здановіч параўнаў, як адлюстраваны асноўныя падзеі вайны ў савецкай і сучаснай гістарыяграфіі. Так, у большасці прац па праблеме пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі Беларусі, выдадзеных у савецкі перыяд, практычна нязменным заставаўся тэзіс аб нечаканасці вайны для Савецкага Саюза, значнай перавазе вермахта ў жывой сіле і тэхніцы. Навуковыя публікацыі 1990-х—пачатку 2000-х гг. паказалі, што ў стратэгічным плане СССР рыхтаваўся да вайны з Германіяй, аднак пралікі яго кіраўніцтва прывялі да таго, што вайна стала нечаканай у ваенна-тэхнічным сэнсе. І.Здановіч адзначыў, што не існуе дакладных дакументальных сведчанняў аб прыняцці рашэнняў савецкага кіраўніцтва аб прэвентыўным удары і таму гаварыць аб рэальнасці дадзенага плана не даводзіцца.

Па праблеме эвакуацыі летам 1941 г. у савецкай гістарыяграфіі аснову складалі працы, прысвечаныя ролі Камуністычнай партыі ў ажыццяўленні эвакуацыйных мерапрыемстваў, у наступным жа гісторыкі звярнулі ўвагу на маладаследаваныя аспекты гэтай праблемы: лёс архіўных устаноў, культурных каштоўнасцей, працу эвакуіраваных у сістэме ГУЛАГа.

Нягледзячы на вялікую колькасць прац па гісторыі партызанскага і падпольнага рухаў, форм і метадаў барацьбы супраць акупантаў у тыле, многія пытанні антыфашысцкай барацьбы, якія не ўпісваліся ў распрацаваную канцэпцыю гісторыі Супраціўлення, у савецкай гістарыяграфіі асвятляліся аднабакова ці наогул заставаліся па-за ўвагай даследчыкаў. У першую чаргу гэта тычылася пытання аб узнікненні падпольных арганізацый і груп без удзелу партыйных органаў і асобных камуністаў, дзейнасці антысавецкага і нацыяналістычнага падполля. У постсавецкі перыяд прадметам дыскусіі сталі характар руху Супраціўлення, роля Камуністычнай партыі ў яго арганізацыі і развіцці. Крытыкуючы недахопы савецкай гістарыяграфіі ў асвятленні азначаных праблем, выступаючы супраць празмернага перабольшвання ролі партыйных органаў у кіраўніцтве ўзброенай барацьбой, У.Здановіч падкрэсліў, што калі б партыя не ўзяла партызанскі рух пад свой кантроль, то ён ператварыўся б у звычайную "партызаншчыну", а не перарос у сапраўдную ўсенародную барацьбу. На яго думку, нягледзячы на існаванне пэўнай часткі калабарацыяністаў сярод беларускага насельніцтва, няма падстаў поўнасцю адмаўляцца ад тэзісу аб усенародным характары партызанскага руху. Пры гэтым неабходна падкрэсліць, што ўсенародны характар гэты рух набыў толькі пачынаючы з восені 1943 г.

У даследаванні акупацыйнага рэжыму намаганні савецкіх гісторыкаў у асноўным былі накіраваны на раскрыццё сутнасці акупацыйнай палітыкі нацысцкіх улад (рабаванне народнай гаспадаркі, фізічнае знішчэнне насельніцтва), якая была "фонам" для паказу арганізаванага Кампартыяй шырокага народнага супраціўлення захопнікам. У 1990-я—пачатку 2000-х гг. актуальнасць набыло даследаванне гісторыі асобных лагераў, генацыду яўрэйскага насельніцтва, прымусовай працы грамадзян Беларусі, аграрнай, медыцынскай, адукацыйнай палітыкі нацыстаў.

Праблема калабарацыянізму не атрымала шырокага асвятлення ў савецкай гістарыяграфіі. Тэрмін

"калабарацыя" ўжываўся пераважна для характарыстыкі адпаведнай з'явы ў заходнееўрапейскіх краінах. У пераважнай большасці сучасных прац адзначаецца, што калабарацыя ў значнай ступені была выклікана даваеннай палітыкай савецкага кіраўніцтва, мела ў гады Вялікай Айчыннай вайны разнастайныя формы і ўзмацняла акупацыйны рэжым у Беларусі. У той жа час некаторыя даследчыкі сталі паказваць калабарацыяністаў не толькі як саюзнікаў нацысцкай Германіі, а як барацьбітоў за нацыянальную культуру і дзяржаўнасць.

У гісторыі змагання ураджэнцаў Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў савецкія гісторыкі акцэнтавалі асноўную ўвагу на гераізме салдат на савецка-германскім фронце, а ў незалежнай Беларусі аб'ектам вывучэння сталі і праблемы ўдзелу беларусаў у іншых воінскіх фарміраваннях (галоўным чынам у Польскіх узброеных сілах на Захадзе), і дзейнасць штрафных батальёнаў і заграджальных атрадаў. У значна меншай ступені распрацавана ў айчыннай гістарыяграфіі праблема ўдзелу ўраджэнцаў Беларусі ў еўрапейскім руху Супраціўлення.

Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у айчыннай гістарычнай навуцы даследавана даволі падрабязна. Аднак калі ў савецкай літаратуры былі паказаны ў асноўным поспехі наступальных аперацый, то сучасныя гісторыкі звярнулі ўвагу на пралікі і недахопы савецкага камандавання, цану вызваленчых аперацый, у тым ліку тых, якія ў кастрычніку 1943 г.—красавіку 1944 г. закончыліся беспаспяхова.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі **Яўген Бараноўскі** падкрэсліў у сваім выступленні, што галоўным і лёсавызначальным для існавання ў Беларусі школы прафесійных гісторыкаў з'яўляецца наяўнасць багатай крыніцавай базы па гісторыі партызанскага і падпольнага руху, якая сканцэнтравана ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь, абласных архівах, Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Ён засяродзіў увагу прысутных на нявыкарыстаных магчымасцях пры рэканструкцыі падзей 1941—1942 гг., высвятленні асаблівасцей некаторых архіўных дакументаў. Так, недастаткова вывучаны і ўзяты пад увагу нямецкія дакументы, якія фарміраваліся з сакавіка па снежань 1941 г., а без іх аналізу вельмі складана зразумець падзеі таго часу, у тым ліку і дзень 26 кастрычніка 1941 г. у Мінску, які па сутнасці можна назваць кануном рашаючага кідка немцаў на Маскву. Вывучэнне вялікага комплексу дакументаў дазваляе гаварыць, што восенню 1941 г. значная колькасць савецкіх вайскоўцаў спрабавала перайсці лінію фронту, каб далучыцца да часцей дзеючых армій. У Мінску яны пражывалі, галоўным чынам, у прыватным сектары і мелі сувязь, як пісалі немцы, толькі з "рускім раёнам". Менавіта па іх нямецкая служба бяспекі нанесла першы ўдар. Трагедыя гэтых людзей была ў тым, што акупацыйныя ўлады многіх з іх не толькі знішчылі, але і абылгалі. Асабліва дасталося кіраўнікам — І.І.Рогаву, П.І.Антохіну, І.М.Бялову. На жаль, да сённяшняга дня некаторыя гісторыкі прылічваюць гэтых людзей да катэгорыі здраднікаў. Былыя савецкія вайскоўцы — баявая група Мінскага падпольнага ГК КП(б)Б (сакратар І.К.Кавалёў), якой было пачата фарміраванне больш за 20 партызанскіх атрадаў і брыгад.

Далей Я.Бараноўскі адзначыў, што асобнае месца ў даследаванні падзей вайны займаюць дакументы камітэтаў дзяржаўнай бяспекі СССР і БССР. Паколькі функцыі Наркамата дзяржбяспекі БССР у ваенны час фактычна выконваліся ведамствамі органаў дзяржбяспекі, якімі кіраваў Л.П.Берыя, адразу пасля вайны многія даныя па гісторыі беларускага падполля апынуліся ў фондах архіўных устаноў КДБ СССР. Гэта стварала дадатковыя гістарыяграфічныя цяжкасці для аднаўлення праўды аб дзвюх вядучых падпольных арганізацыях — Мінскай і Магілёўскай. Больш-менш поўная праўда аб Мінскім падполлі была адноўлена да 1959 г., а аб Магілёўскім — толькі да 1964 г. Гэтую праўду трэба абараняць і сёння, бо маюць месца спробы зноў кінуць цень на дасягненні падпольных арганізацый. У якасці адной з іх Я.Бараноўскі прывёў кнігу Б.Сакалова "Оккупация: Правда и мифы" (Москва, 2002).

Я.Бараноўскі лічыць, што заклікі некаторых аўтараў надрукаваць усе падпольныя матэрыялы запар — гэта шлях у нікуды, паколькі амаль 70% з іх былі створаны ў час існавання прадузятага абвінавачага ўхілу з боку некаторых саюзных органаў улады да беларускага гарадскога антыфашысцкага падполля, якое нараджалася ў 1941—1942 гг. на аснове самачыннага руху "знізу". Ёсць разыходжанні і ў самой назве "Мінскае падполле". Спачатку яно называлася "камуністычным", потым "партыйным", пазней "патрыятычным". У 1995 г. група беларускіх гісторыкаў у спецыяльным звароце да выдавецтваў прапанавала называць падполле г. Мінска "Мінскім антыфашысцкім падполлем".

Я.Бараноўскі таксама ўзгадаў, што ў красавіку 2010 г. спаўняецца 45 гадоў з часу другога масавага ўзнагароджання ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага руху Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны — вялікай патрыятычнай акцыі, якая ахапіла амаль усе слаі насельніцтва. За ўдзел у партызанскім і падпольным руху ў Беларусі званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена яшчэ 12 людзям. На жаль, сярод пяці Герояў Савецкага Саюза — удзельнікаў Мінскага антыфашысцкага падполля — не аказалася ніводнага карэннага мінчаніна, ніводнага беларуса, хоць менавіта беларусы складалі 80% ад агульнай колькасці падпольшчыкаў. У канцы свайго выступлення Я.Бараноўскі сказаў: "Падполле — адзіны ваенны фронт, дзе не існавала справаводства. Падпольшчыкі, якія накіроўваліся на выкананне небяспечных заданняў, верылі ў аб'ектыўную гісторыю. За яе адказваем і мы сваімі працамі, дакладнасцю іх крыніц".

Загадчык кафедры гуманітарных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі

і радыёэлектронікі, доктар гістарычных навук, прафесар **Яўген Новік** падвергнуў крытыцы кнігу беларускага гісторыка З.Шыбекі "Нарыс гісторыі Беларусі. 1795—2002" (Мінск, 2003), у якой вызваленчы паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну названы "савецкай захопніцкай акцыяй", а словы "вызваленчы паход" узяты ў двукоссе. Адпаведныя раздзелы ў кнізе названы: "Падпальшчыкі сусветнай вайны" і "Ваенныя дзеянні "саюзнікаў" супраць Польшчы".

Я.Новік нагадаў, што Другую сусветную вайну пачала нацысцкая Германія нападам на Польшчу 1 верасня 1939 г., а СССР увёў свае войскі ў Заходнюю Беларусь і Заходнюю Украіну тады, калі Польская дзяржава была ўжо фактычна знішчана, яе ўрад пакінуў краіну, а над беларускімі і ўкраінскімі землямі навісла пагроза нацысцкага рабавання. Да таго ж, Савецкі Саюз і нацысцкая Германія не былі саюзнікамі: ні ў дагаворы аб ненападзенні ад 23 жніўня 1939 г., ні ў дадатковым сакрэтным пратаколе да яго не ўтрымліваліся артыкулы аб узаемнай дапамозе, сумесных ваенных дзеяннях супраць дзяржаў, якія напалі б на адну з краін.

Звярнуў Я.Новік увагу і на тое, што ў кнізе З.Шыбекі паняцце "Вялікая Айчынная вайна" наогул не ўжываецца, а параграфы называюцца так: "Разгар нямецка-савецкай вайны. Чэрвень 1941 г. — верасень 1943 г.", "Напрыканцы нямецка-савецкай вайны. Верасень 1943 г. — май 1945 г.". Сказаў ён і пра кнігу выкладчыкаў БДУ "Гісторыя Беларусі. У 2 частках. Частка 2. XIX—XX стагоддзі: Курс лекцый" (Мінск, 2002), дзе тэма VII называецца "Беларусь у перыяд Другой сусветнай вайны" і ніводная з назваў лекцый не ўтрымлівае паняцця "Вялікая Айчынная вайна", а таксама пра кнігу "Гісторыя Беларусі ў кантэксце еўрапейскай цывілізацыі: Дапаможнік" (Мінск, 2003), выдадзеную Рэспубліканскім інстытутам вышэйшай школы. У гэтай сувязі Я.Новік адзначыў: "Складваецца ўражанне, што гэтыя кнігі пісалі не нашчадкі гераічнага савецкага народа, які ў чэрвені 1941 г. стаў на абарону сваёй Айчыны, а нашчадкі амерыканцаў, англічан і французаў, для якіх 1939—1945 гг. сапраўды з'яўляюцца гадамі Другой сусветнай вайны. Для беларусаў, як і для прадстаўнікоў іншых народаў вялікага Савецкага Саюза, 1941—1945 гг. — гэта гады Вялікай Айчыннай вайны савецкага народа. Цяжка паверыць у тое, што прафесійныя беларускія гісторыкі гэтага не ведаюць ці пра гэта забыліся".

Доктар гістарычных навук, прафесар кафедры паліталогіі і права Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка **Эмануіл Іофе** пагадзіўся з іншымі даследчыкамі ў тым, што ў першую чаргу неабходна гаварыць аб існуючых да сённяшняга дня "белых плямах" гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Асаблівую каштоўнасць у справе ліквідацыі гэтых "белых плям" маюць 23 зборнікі дакументаў і матэрыялаў, выдадзеныя ў апошнія гады беларускімі архівістамі.

Э.Іофе акцэнтаваў увагу на новай інфармацыі ў параўнанні з папярэднімі даследаваннямі ў манаграфіі брэсцкага гісторыка Г.А.Грабенкінай "Брест непокорённый: антифашистское подполье г. Бреста и Брестского района в годы Великой Отечественной войны (1941—1944)" (Мінск, 2005), работах С.Новікава, які на падставе глыбокага аналізу дакументаў з архіваў ФРГ пераканаўча даказаў, што ў нас ёсць падставы зрабіць выснову, што ў ліпені 1941 г. адбылася "Магілёўская бітва", а не толькі "абарона Магілёва". Э.Іофе адзначыў, што выйшлі дзесяткі кніг аб дзейнасці савецкай разведкі на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і ніводнай аб дзейнасці нямецкай разведкі на тэрыторыі БССР у 1939—1945 гг. Гісторык вырашыў ліквідаваць гэтую "белую пляму", і ў 2007—2008 гг. у выдавецтве "Харвест" двума тыражамі выйшла яго кніга аб дзейнасці нямецкіх спецслужб на тэрыторыі Беларусі ў 1939—1945 гг. пад назвай "Абвер, полиция безопасности и СД, тайная полевая полиция, отдел "Иностранные армии — Восток" в западных областях СССР. Стратегия и тактика: 1939—1945".

Звярнуў увагу Э.Іофе і на адлюстраванне гісторыі партызанскага руху на старонках беларускай прэсы. Так, газета "Комсомольская правда" в Белоруссии" ад 28 верасня 2007 г. змясціла матэрыял Я.Валошына "Партизаны выдали сельчан за полицаев?" — аб забойстве 14 красавіка 1943 г. мірных жыхароў у в. Дражна Старадарожскага раёна, дзе партызанскае камандаванне і асобныя партызаны прадстаўлены як забойцы і нават адчуваецца сімпатыя да калабарацыяністаў. Ён адзначыў, што гэты матэрыял быў напісаны з падачы В.Хурсіка, і што як В.Хурсік, так і Я.Валошын замоўчваюць той факт, што ў в. Дражна ў гады вайны размяшчаўся адзін з самых моцных у Беларусі паліцэйскіх гарнізонаў, які налічваў 365 чалавек, і актыўную ролю ў якім адыгрывалі мясцовыя калабарацыяністы.

Расказаў Э.Іофе і пра даведнік "Высшее партизанское командование Белоруссии, 1941—1944" (Мінск, 2009), падрыхтаваны калектывам з 8 гісторыкаў (Э.Р.Іофе, Г.В.Галінская, В.Я.Казачонак, К.І.Козак, Д.А.Крывашэй, А.М.Максімчык, У.П.Мароз, Н.А.Яцкевіч) пад яго кіраўніцтвам. У ім дадзена гісторыя пастаянных і часовых партызанскіх злучэнняў Беларусі, прыведзены даныя аб 120 прадстаўніках ваеннага камандавання, кіраўніках і адказных супрацоўніках Паўночна-Заходняй аператыўнай групы ЦК КП(б)Б і СНК БССР, ЦШПР, БШПР, камандзірах, камісарах і начальніках штабоў пастаянных і часовых партызанскіх злучэнняў. Э.Іофе акцэнтаваў увагу на тым, што прапаноўваў назваць даведнік "Высшее советское партизанское командование Белоруссии", паколькі на тэрыторыі Беларусі акрамя савецкіх партызан дзейнічалі атрады Арміі Краёвай, УПА і нацыяналістычных партызан, але ў выдавецтве "Беларусь" не прыслухаліся да гэтай прапановы.

У 2009 г. выйшла выданне Э.Іофе "Белорусский штаб партизанского движения". Аўтар адзначае, што ў нашых падручніках, даведніках і энцыклапедыях прыводзяцца лічбы, што партызаны Беларусі ў час вайны забілі і паранілі 500 тыс. акупантаў (у

некаторых з іх дабаўляецца слова "і іх памагатых"). Аднак, па яго падліках, калі лічыць толькі забітых, то атрымліваецца не больш за 100 тыс. акупантаў і калабарацыяністаў. І ўвогуле, лічбы забітых і параненых акупантаў не прыводзіць ні адна краіна свету за выключэннем Беларусі. Таксама Э.Іофе лічыць, што трэба перастаць ужываць паняцце "ўсенародная партызанская вайна" і карыстацца замест яго паняццем "народная партызанская вайна", паколькі нельга забываць аб суадносінах партызан і калабарацыяністаў на тэрыторыі Беларусі і аб ступені размаху партызанскага руху на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Аналізуючы матэрыялы аб эвакуацыі насельніцтва з Беларусі ў розныя рэгіёны Расійскай Федэрацыі, Арменію, Казахстан, Таджыкістан, Туркменістан, Узбекістан у Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь і Дзяржаўным архіве Расійскай Федэрацыі, Э.Іофе атрымаў лічбу афіцыйна зарэгістраваных эвакуіраваных у 300 тыс. чалавек, а не 1,5 млн, як падаецца ў энцыклапедыях і дапаможніках па гісторыі Беларусі. Такім чынам, на погляд Э.Іофе, колькасць эвакуіраваных з Беларусі ў 1941 г. у нашых дапаможніках і энцыклапедыях павялічана мінімум у два, а максімум — у пяць разоў.

Узгадваліся ў выступленні і нямецкія крыніцы, паводле якіх першым кіраўніком антыфашысцкага падполля ў Мінску быў Ісай Казінец, а не Іван Кавалёў. Узняў Э.Іофе таксама далікатнае пытанне аб тым, што паводле неафіцыйных даных, у акупіраваных краінах Еўропы за гады Другой сусветнай вайны нарадзілася каля 3 млн дзяцей, бацькамі якіх былі немцы, у тым ліку каля 300 тыс. на беларускай зямлі.

Малодшы навуковы супрацоўнік аддзела ваеннай гісторыі і міждзяржаўных адносін Інстытута гісторыі НАН Беларусі **Яраслаў Бязлепкін** прысвяціў сваё выступленне гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

Ён адзначыў: "Рэдактары амерыканскага часопіса "Крытыка. Даследаванні па рускай і еўразійскай гісторыі" ў 2008 г. у сваім артыкуле "Праходзячы скрозь "жалезны занавес" вымушаны былі прызнаць, што сёння геапалітыка ў значна большай ступені ўплывае на акадэмічныя даследаванні, чым гэта было ў гады "халоднай вайны". Таму сёння праблема ўплыву геапалітыкі на даследаванні па ваеннай гісторыі набывае не толькі навуковае, але і грамадска-палітычнае значэнне".

Пачынаючы з другой паловы 1980-х гг. у гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі адбылася моцная трансфармацыя поглядаў, канцэпцый і падыходаў, звязаная з так званымі "архіўнай" і "метадалагічнай" рэвалюцыямі. У навуковы зварот былі ўведзены новыя дакументальныя матэрыялы, крытычна пераасэнсаваны многія канцэпцыі часоў "халоднай вайны" (празмерны давер да нямецкай мемуарыстыкі і германскіх крыніц змяніўся на крытычнае стаўленне да іх), больш актыўна пачалі выкарыстоўвацца матэрыялы з расійскіх архіваў, а таксама напрацоўкі савецкай і расійскай гістарыяграфіі. Аднак старыя ідэалагічныя канцэпцыі і сёння служаць навуковым бар'ерам. Я.Бязлепкін прывёў прыклады, калі некаторыя заходнія гісторыкі (у прыватнасці, А.Рыбер, Дж.Барбер) прапаноўваюць адмовіцца ад тэрміна "Вялікая Айчынная вайна" і замяніць яго на "савецкія грамадзянскія войны". Пры гэтым большасць заходніх аўтараў "забываюць" паказаць тыя захады, якія рабіліся германскімі акупацыйнымі ўладамі па распальванню міжэтнічных канфліктаў (пра што ў свой час пісалі беларускі гісторык В.Рамановскі, польскі гісторык Ю.Туронак і многія іншыя даследчыкі). У той жа час у вядучых навуковых выданнях спакойна ўжываецца тэрмін "Great Patriotic War" (Вялікая Айчынная вайна).

Дастаткова шырокае выкарыстанне матэрыялаў з расійскіх, амерыканскіх, нямецкіх і англійскіх архіваў дазволіла англамоўным гісторыкам скласці больш поўнае ўяўленне пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны (напрыклад, у працах англійскага гісторыка Б.Шэферда ёсць звесткі пра населеныя пункты Гомельшчыны ў 1941—1944 гг.). Аднак у гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі вельмі мала прац, у якіх паказана статыстыка германскіх страт пачынаючы з першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Ва ўмовах адкрытага доступу да вялікай колькасці крыніц актуальнай застаецца праблема "выбіральнасці" даследчыкаў пры падборы і выкарыстанні архіўных матэрыялаў, а таксама іх інтэрпрэтацыі.

Калі ў часы "халоднай вайны" заходнія гісторыкі скардзіліся на заідэалагізаваныя савецкія працы і немагчымасць атрымаць доступ у савецкія архівы, то пасля распаду СССР яны пачалі спакойна выкарыстоўваць працы савецкіх гісторыкаў. Гэта ў першую чаргу тычыцца Д.Глэнца — бадай, самага вядомага на сённяшні дзень амерыканскага даследчыка гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Яшчэ адной праблемай сучаснай англамоўнай гістарыяграфіі ЗША і Вялікабрытаніі Я.Бязлепкін лічыць павярхоўнасць пры аналізе ваеннай гісторыі і фактычна замоўчванне прац тых даследчыкаў, якія негатыўна ацэньваюць падзеі перыяду Вялікай Айчыннай вайны (Дж.Эрыксана, Ц.Малігана, К.Сляпяна і інш.). Сёння гістарыяграфія ЗША і Вялікабрытаніі па даследаванню гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны фактычна знаходзіцца на навуковым раздарожжы. Адна частка даследчыкаў імкнецца да як мага большага выкарыстання разнастайных дакументальных матэрыялаў з архіваў ЗША, Вялікабрытаніі, Германіі, Расіі, уводзіць у навуковы зварот новыя факты, у той час як другая імкнецца разглядаць ваенную тэматыку па названай тэме ў кантэксце паліталогіі і сацыялогіі, што ў рэшце рэшт можа прывесці да распаду самога прадмету ваеннай гісторыі на адасобленыя праблемы. Шырокае выкарыстанне метадаў сацыяльна-культурнай гісторыі можа мець вынікам скажэнні пры аналізе канкрэтна-гістарычных падзей. У якасці аднаго з прыкладаў Я.Бязлепкін прывёў спалучэнне нямецкіх успамінаў і савецкіх дакументаў ваеннай пары — гістарычных крыніц, якія нельга назваць раўназначнымі.

Галоўны рэдактар часопіса "Беларуская думка", кандыдат гістарычных навук **Вадзім Гігін** у сваім

выступленні сказаў, што сумненні наконт усенароднага характару партызанскай барацьбы нават не павінны выказвацца. Для гістарычнай памяці і свядомасці беларусаў ставіць пад сумненне ўсенароднасць антыфашысцкай барацьбы — усё роўна, што ў сучасным свеце адмаўляць факт Халакосту. Тым больш, што для гэтага няма ніякіх гістарычных падстаў. Ён адзначыў: "Па-першае, па якіх крытэрыях вызначаецца ўсенароднасць барацьбы? Калі паводле працэнту ахопу насельніцтва, то нават агульная колькасць партызан і падпольшчыкаў (440 тыс.) не перавышае 4,5% ад даваеннага насельніцтва Беларусі. Аднак, на самай справе такога ўздыму партызанскага руху, як у Беларусі, не ведала ніводная краіна. Амаль нідзе Супраціўленне не налічвала ў сваіх шэрагах больш за 1% насельніцтва і амаль нідзе не перавышала па колькасці фарміраванні калабарацыяністаў. Такое назіралася толькі ў Беларусі, магчыма, яшчэ ў Грэцыі, у апошні перыяд вайны ў Югаславіі. Сам характар партызанскай і падпольнай барацьбы вызначаў, што колькасць актыўных байцоў не можа быць надта вялікая. Але партызанская вайна магчыма толькі пры шырокай, сапраўды ўсенароднай падтрымцы насельніцтва".

В.Гігін таксама адзначыў, што нельга ўскладваць на Г.Жукава ўсю віну за паражэнні першых месяцаў вайны. Ён стаў начальнікам Генеральнага штаба толькі ў лютым 1941 г., і за такі кароткі тэрмін, які заставаўся да пачатку вайны і сутыкнення з вермахтам, ён нічога не здолеў бы зрабіць. Каб зразумець, чаму менавіта так, В.Гігін параіў прачытаць артыкул А.Літвіна аб савецка-фінляндскай вайне ў часопісе "Беларуская думка", з якога відавочна, што асноўнымі характарыстыкамі Чырвонай Арміі былі бязглуздзіца, нявывучанасць, хаос. І вінаваты ў гэтым, на думку В.Гігіна, не Г.Жукаў ці рэпрэсіі 1937 г., а Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 г. Чырвоная Армія выйграла Грамадзянскую вайну толькі дзякуючы неверагоднай волі бальшавікоў, унікальнаму апарату прымусу і канцэнтрацыі палітычнай волі, які ўяўляла сабой Камуністычная партыя. Фактычна паўнавартасная, сучасная армія ў СССР пачала стварацца толькі ў 1939 г, і да пачатку вайны гэты працэс не быў завершаны.

У канцы свайго выступлення В.Гігін прапанаваў гісторыкам не ўжываць у дачыненні да Беларусі і СССР тэрмін "Другая сусветная вайна", а гаварыць толькі "Вялікая Айчынная вайна". Гэта і павінна, на яго думку, стаць укладам у захаванне памяці пра тую сапраўды народную вайну.

Дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны **Сяргей Азаронак**, як і іншыя ўдзельнікі круглага стала, акцэнтаваў увагу на недапушчальнасці фальсіфікацыі падзей вайны. Ён адзначыў, што кіраўніцтва музея імкнецца цесна супрацоўнічаць з даследчыкамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі ў справе падрыхтоўкі новай экспазіцыі музея. Так, у склад рабочай групы па яе распрацоўцы будуць абавязкова ўключаны прадстаўнікі "акадэмічнай" навукі. Пры гэтым падчас падрыхтоўкі экспазіцыі на сучасным узроўні неабходна пазбегнуць як правага, так і левага ўхілу, каб падзеі вайны былі адлюстраваны як мага больш поўна і аб'ектыўна. Гэта тычыцца і такіх спрэчных момантаў нашай гісторыі, як дзейнасць Арміі Краёвай, Арміі Людовай, калабарацыянісцкіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі. С.Азаронак падкрэсліў, што калі гэтыя праблемы не будуць закрануты, абмеркаваны на навуковым узроўні і адлюстраваны належным чынам у экспазіцыі музея, то гэта будзе толькі распальваць радыкальныя ацэнкі падзей вайны.

Кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры упраўлення Мінскага гарадскога інстытута развіцця адукацыі **Марына Краснова** ў сваім выступленні засяродзіла ўвагу на вывучэнні факультатыву ў агульнаадукацыйных установах і спецкурса ў ВНУ "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)". Яна нагадала, што для сённяшніх старшакласнікаў і студэнтаў вайна — гэта даўняя гісторыя, якая большасцю з іх успрымаецца таксама, як напрыклад, гісторыя Першай сусветнай вайны альбо Айчыннай вайны 1812 г. Пра вайну яны могуць даведацца ўжо не ад бабуль і дзядуль, а ад пакалення сваіх прабабуль і прадзядуль. Як і іншыя ўдзельнікі круглага стала, М.Краснова адзначыла, што сёння і ў навуковай літаратуры, і ў сродках масавай інфармацыі шмат увагі сталі надаваць маловядомым альбо невядомым старонкам вайны, пераглядаць ацэнкі тых ці іншых падзей, прычым назіраецца тэндэнцыя прыменшыць ролю Савецкага Саюза і перабольшыць значэнне краін заходняй дэмакратыі ў разгроме нацысцкай Германіі і мілітарысцкай Японіі. Адмаўленне ад назвы "Вялікая Айчынная вайна", абвяржэнне ўсенароднага характару антыфашысцкай барацьбы, перабольшанне значэння штрафных батальёнаў і рот і, наадварот, прымяншэнне значэння партызанскага руху прыводзіць да таго, што ў падрастаючага пакалення складваецца сваё ўяўленне аб вайне, якое не ў поўнай меры адпавядае рэчаіснасці. Сістэматычны курс вывучэння Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў павінен сфарміраваць у іх адэкватнае разуменне падзей таго часу.

М.Краснова адзначыла, што старшакласнікі і студэнты не жадаюць простага паўтору той інфармацыі, якой ужо валодаюць, а хочуць даведвацца аб вайне па дакументах, абмяркоўваць тыя пытанні, якія іх хвалююць. Такую магчымасць, як правіла, даюць семінарскія заняткі, аднак у гэтым годзе ні семінарскіх, ні практычных заняткаў для студэнтаў ВНУ не прадугледжана, што зніжае патэнцыял спецкурса. А патэнцыял гэты вялікі, паколькі вывучэнне гісторыі для вучняў і студэнтаў мае не толькі пазнавальны, але і выхаваўчы характар.

Кандыдат гістарычных навук, дацэнт **Галіна Болсун** расказала аб спецыфіцы вывучэння і выкладання спецкурса "Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)" на прыкладзе гістарычнага факультэта БДУ. Для студэнтаў-гісторыкаў каштоўнасць гэтага спецкурса тым большая, што самі яны — будучыя настаўнікі, якія павінны садзейнічаць сацыялізацыі школьнікаў, асэнсаванню імі сваёй прыналежнасці да вызнача-

най дзяржаўнай, культурнай, нацыянальнай агульнасці, разуменню разнастайнасці сучаснага свету і неабходнасці дыялогу паміж прадстаўнікамі розных культур і пакаленняў. Г.Болсун адзначыла, што калі выхаваўчыя задачы спецкурса відавочны, то адукацыйныя патрабуюць больш падрабязнага разгляду. На аснове свайго пяцігадовага вопыту выкладання спецкурса яна зрабіла выснову, што завучванне храналогіі падзей часта нават не дазваляе студэнтам задумвацца над той ці іншай праблемай. Так, пры адказе на пытанне аб прычынах перамогі Чырвонай Арміі пад Масквой студэнты ўсё часцей ставяць на першае месца суровую рускую зіму.

Вопыт дазволіў Г.Болсун зрабіць і яшчэ адну выснову — аб вялікай цікавасці студэнцкай моладзі да гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Гэта дэманструюць і студэнцкія навуковыя канферэнцыі, якія штогод праводзяцца на гістарычным факультэце БДУ. Тэматыка паведамленняў, актыўная палеміка па дыскусійных пытаннях, якасць і скрупулёзнасць многіх даследаванняў сведчаць аб імкненні студэнтаў пашырыць і паглыбіць веды па гісторыі вайны. У канцы выступлення Г.Болсун адзначыла тыя праблемы, якія выклікаюць найвялікшую палеміку, а таксама тыя, што не атрымалі належнага асвятлення ў навучальнай літаратуры — у прыватнасці, працэс фарміравання ваенна-палітычных груповак у 1939—1941 гг., пытанне аб адказнасці за распальванне вайны і г.д.

Начальнік групы арганізацыі ваенна-гістарычнай і геральдычнай работы ваенна-навуковага камітэта Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, падпалкоўнік **Віталь Чырвінскі** расказаў аб ваенна-гістарычнай рабоце ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь у рамках мерапрыемстваў, прысвечаных 65-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Ён назваў асноўныя тэмы ваенна-гістарычных даследаванняў, над якімі працуюць выкладчыкі і студэнты Ваеннай акадэміі, ваеннай кафедры Віцебскага дзяржаўнага універсітэта імя П.М.Машэрава, ваеннага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы, ваенна-тэхнічнага факультэта Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта, ваеннага факультэта Мінскага дзяржаўнага вышэйшага авіяцыйнага каледжа, супрацоўнікі ваенна-навуковага аддзела Галоўнага штаба сухапутных войскаў.

Ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь праводзяцца спецыяльныя заняткі для ваеннаслужачых, урокі мужнасці для моладзі, паходы па месцах баёў, экскурсіі ў музеі, мемарыялы, пакоі баявой славы і іншыя памятныя ваенна-гістарычныя месцы. Ваенна-навуковы камітэт Узброеных Сіл прыняў удзел у правядзенні тэндэра па вырабу адзінага юбілейнага медаля "65 лет Победы в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг.", эскіз якой быў зацверджаны 10 кастрычніка 2008 г. рашэннем Савета глаў дзяржаў СНД. Тэндэр на выраб юбілейнай узнагароды ў Беларусі выйграў Віцебскі прыборабудаўнічы завод, дзе плануецца вырабіць 85 тысяч юбілейных медалёў. Імі будуць узнагароджаны ветэраны вайны, ваеннаслужачыя Узброеных Сіл Беларусі, іншых войскаў і воінскіх фарміраванняў, а таксама дзяржаўныя служачыя і іншыя асобы, якія ўнеслі значны ўклад у патрыятычнае выхаванне грамадзян Беларусі, увекавечванне памяці загінуўшых, арганізацыю юбілейных мерапрыемстваў, прысвечаных 65-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.

У пасяджэнні круглага стала і дыскусіях падчас яго ўдзел таксама прынялі член Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Савіцкі; акадэмік НАН Беларусі, галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі Уладзімір Гніламёдаў; галоўны рэдактар часопіса "Полымя" Мікалай Мятліцкі.

Ад рэдакцыі адзначым, што пытанне аб спробах перагляду і пераасэнсавання гістарычнага значэння Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне сёння ўзнімаецца і на дзяржаўным узроўні. Так, у дэкларацыі дзяржаў-удзельніц Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ) ад 25 сакавіка 2010 г. гаворыцца аб недапушчальнасці любых спроб перагляду гістарычнага значэння Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, вынікаў Другой сусветнай вайны, скажэнняў ацэнак таго перыяду.

Выступленні і дыскусіі ўдзельнікаў круглага стала яскрава дэманструюць, што нават сярод спецыялістаў ёсць розныя думкі адносна ключавых пытанняў і ацэнак гісторыі вайны. Палеміку выклікала пытанне аб характары барацьбы насельніцтва Беларусі супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў — ці была яна ўсенародная (як гэта традыцыйна для нашай гістарыяграфіі), ці сёння яе варта акрэсліваць толькі як народную. Адны навукоўцы выступаюць за тое, што гісторыю трэба пісаць толькі па архіўных дакументах, іншыя нагадваюць, што дакументы бываюць рознай ступені надзейнасці. Акрамя вывучэння дакументаў важна таксама захаваць успаміны ўдзельнікаў і сведак той вайны, а яны ў розных людзей самыя розныя.

"Белыя плямы" гісторыі той вялікай вайны, аб якой сёння могуць расказаць апошнія сведкі, канечне, павінны быць па магчымасці вывучаны. Задача сродкаў масавай інфармацыі — часопісаў і газет — расказаць аб новых падыходах у даследаванні гісторыі вайны, надрукаваць успаміны людзей, якія яе перажылі. Пры гэтым нельга дапусціць, каб гэтыя "белыя плямы" былі "замаляваны" домысламі і няпраўдай. І ў гэтым вялікая адказнасць нашых навукоўцаў, даследчыкаў ваеннай гісторыі перад беларускім грамадствам.

У канцы адзначым, што матэрыял, прысвечаны кругламу сталу, рэдакцыя вырашыла назваць, здавалася б, проста і звычайна — "Вялікая Айчынная вайна". Аднак назва, якая дзесяцігоддзямі была традыцыйная для савецкай гістарычнай навукі, сёння набывае новы сэнс, паказвае пазіцыі, якіх прытрымліваецца той ці іншы гісторык або выданне.

*Падрыхтавала Надзея Кушнер.*